# Сінтаксіс
# і
# пунктуацыя

## Словазлучэнне

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

## Словазлучэнне

**Сказы (за выключэннем назыўных і неразвітых двухсастаўных) можна падзяліць на асобныя сінтаксічныя часткі – словазлучэнні, кампаненты якіх звязаны падпарадкавальнай сувяззю.**

**Словазлучэнне – гэта сінтаксічная адзінка, якая складаецца з двух ці больш самастойных слоў, аб'яднаных сэнсава і граматычна.**

**Канкрэтную функцыю і значэнне словазлучэнні набываюць у сказе:**
***вясёлы хлопчык, сонечны дзень, мастацкая школа, шчаслівыя імгненні***

**Не з'яўляецца словазлучэннем спалучэнне дзейніка і выказніка, бо яно выражае закончаную думку і з'яўляецца граматычнай асновай простага сказа з двума галоўнымі членамі.**

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

**У адпаведнасці з марфалагічным выражэннем галоўнага слова словазлучэнні падзяляюцца на:**

**дзеяслоўныя – з галоўным словам дзеясловам:**
***пісаць пісьмо, спяшацца на поезд, глядзець спектакль***

**іменныя:**
**– з галоўным словам назоўнікам:**
***прыгожая песня, сустрэча сяброў***
**– з галоўным словам прыметнікам:**
***шчаслівы без меры, мокры ад дажджу***
**– з галоўным словам займеннікам:**
***хтосьці з нас, кожны з вучняў***
**– з галоўным словам лічэбнікам:**
***пяць метраў, пятнадцаць шарыкаў***

**прыслоўныя – з галоўным словам прыслоўем:**
***нізка над зямлёй, нечаканы для ўсіх***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

**Сінтаксічныя адносіны паміж словамі ў словазлучэнні складаюцца на аснове граматычных значэнняў слоў:**

**азначальныя сінтаксічныя адносіны**
**маюць словазлучэнні з назоўнікаў і залежных прыметнікаў з граматычным значэннем прадмета і яго прыметы:**
***памяць (якая?) добрая; трава (якая?) зялёная***

**аб’ектныя сінтаксічныя адносіны**
**паміж галоўным і залежным словамі**
**маюць словазлучэнні з граматычным значэннем дзеяння і прадмета, на які яно пераходзіць:**
***рашаць (што?) задачу; пісаць (што?) пісьмо***

**акалічнасныя сінтаксічныя адносіны**
**паміж галоўным і залежным словамі**
**маюць словазлучэнні з граматычным значэннем дзеяння і яго прыметы:**
***прывітаць (як? якім чынам?) па-сяброўску***

**Граматычным значэннем словазлучэння**
**з’яўляецца агульнае значэнне словазлучэнняў аднолькавай будовы**

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Словазлучэнні

## Простыя

- Словазлучэнні складаюцца з двух самастойных слоў
- Словазлучэнні , якія складаюцца з большай колькасці слоў, калі ў іх склад уваходзяць:
  - складаныя граматычныя формы
    *буду чытаць кнігу*
  - формы ступеняў параўнання
    *самы высокі дом*
  - складаныя колькасныя лічэбнікі
    *сорак пяць кіламетраў*
- Фразеалагізмы
  *бачыцца гады ў рады*

## Складаныя

Словазлучэнні уключаюць тры і больш самастойныя словы
*дзяўчынка з блакітнымі вачыма*

Складаныя словазлучэнні ўзнікаюць:

- шляхам развіцця простага словазлучэння асобным словам:
  *аўтобусны парк – слуцкі аўтобусны парк*
- шляхам развіцця асноўнага слова простым словазлучэннем:
  *хлопчык выключных здольнасцей*
- шляхам развіцця асноўнай часткі, якая з'яўляецца простым словазлучэннем, залежнай часткай – таксама простым словазлучэннем
  *нацыянальны герой – нацыянальны герой беларускага народа*

# Сувязь слоў у словазлучэнні

У словазлучэнні словы звязваюцца трыма відамі сувязі:
дапасаваннем, кіраваннем і прымыканнем

## Дапасаванне –

від падпарадкавальнай сувязі, пры якім залежнае слова набывае тыя ж граматычныя формы, што і галоўнае:

*свежая **трава**, скошаная **трава**, першая **трава***
*(залежныя словы свежая, скошаная, першая маюць тыя самыя формы (адз. л., ж.р., Н. скл.), што і галоўнае **трава**)*

## Кіраванне –

від сувязі, пры якім залежнае слова становіцца ва ўскосным склоне, якога патрабуе галоўнае.

Кіраванне бывае беспрыназоўнікавым
*(**паважаць** старэйшых)*
і прыназоўнікавым
*(**сустрэцца** з сябрам).*

Пры змяненні галоўнага слова залежнае не змяняецца
*(**помніць** пра Хатынь, **помні** пра Хатынь, **помню** пра Хатынь)*

## Прымыканне –

від сувязі, пры якім нязменнае залежнае слова далучаецца да галоўнага па сэнсе.

Прымыкаюць прыслоўі, неазначальная форма дзеяслова, дзеепрыслоўі:

*__вывучыць__ дасканала,*
*__жаданне__ сустрэцца,*
*__чытаць__ седзячы*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове

У беларускай мове **лічэбнікі** ***два (дзве), абодва (абедзве), тры, чатыры*** **дапасуюцца** да назоўнікаў, якія маюць **форму множнага ліку**:
***два сталы, абодва браты, тры яблыкі***

**Дзеясловы** ***дзякаваць (падзякаваць, аддзякаваць, аддзячыць), выбачаць, прабачаць, дараваць***, кіруючы назоўнікамі (займеннікамі), патрабуюць **давальнага склону**:
***дзякаваць бацьку (сястры, бабулі, дзядулю), выбачаць сябру (мне, яму, ёй)***

Пры дзеясловах ***жартаваць, насміхацца, смяяцца, рагатаць, дзівіцца, кпіць, здзекавацца*** ўжываюцца назоўнікі **роднага склону з прыназоўнікам *з***:
***насміхацца з малога, здзекавацца з чалавека***

Дзеясловы руху ***ісці, бегчы, ехаць, ляцець і інш.*** пры абазначэнні мэты дзеяння ўтвараюць словазлучэнні **з вінавальным склонам назоўніка ці займенніка з прыназоўнікам *па***:
***схадзіць па хлеб, ісці па яе***
калі пасля такіх дзеясловаў ужываюцца словы ***ягады, грыбы (або іх канкрэтныя назвы), рыба, шчаўе, дровы, буракі, кмен і інш.***, то назоўнікі ўжываюцца ў форме **вінавальнага склону з прыназоўнікам *у***:
***пайшлі ў маліны, паехалі ў дровы, выбраліся ў млын***

Пры дзеясловах ***хварэць, захварэць, перахварэць*** і прыметніку ***хворы*** назоўнікі ўжываюцца ў **вінавальным склоне з прыназоўнікам *на***:
***хворы на ангіну, перахварэць на грып***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

## Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове

Дзеясловы *ажаніць, ажаніцца* патрабуюць творнага склону з прыназоўнікам *з*:
*ажаніцца з Тацянай, ажанілі з нялюбай*

У дзеяслоўных і назоўнікавых словазлучэннях з прыназоўнікам *па*
ўжываюцца назоўнікі і займеннікі ў месным склоне:
*ездзілі па гарадах і вёсках, сумавалі па блізкіх, па старадаўнім звычаі, вучыўся па кнігах, размаўляць па тэлефоне*

У параўнальных словазлучэннях залежнае слова ўжываецца ў *вінавальным склоне з праназоўнікам за*:
*старэйша за брата, зрабіў лепш за суседа*

Прыназоўнік *праз* ужываецца для выражэння:

– прычынных адносін:
*спазніўся праз дождж, спазненне праз дождж*

– аб'ектных адносін пасля дзеясловаў са значэннем *пранікаць, прабівацца*:
*прамень праз шчыліну, прабіцца праз гушчар*

– у спалучэннях
*праз зубы, праз слёзы, праз сон*

У спецыфічных словазлучэннях:
*дом на тры паверхі, падобны да брата, загадчык бібліятэкі, пазычыла нажа, дасылаць на адрас, больш за тры кіламетры, за тры крокі ад мяне, яма на сілас, бачыў на свае вочы, прыйшоў а пятай гадзіне*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Парадак слоў у словазлучэнні

**Парадак слоў** не толькі ўплывае на характар сінтаксічных адносін у словазлучэннях, але і ў пэўнай меры абумоўлівае іх значэнне:
***словазлучэнне дзесяць метраў абазначае дакладную меру***
***словазлучэнне метраў дзесяць абазначае прыблізную меру***

**Стаяць перад галоўным словам**
**дапасаваныя словы (залежныя):**
***добры настрой***
***выдатныя поспехі***

**Стаяць пасля галоўнага слова**
**залежныя словы пры кіраванні**
***прачытаць верш***
***зарад бадзёрасці***

**Залежныя прымыкальныя словы**
**могуць стаяць як перад галоўным словам (звычайна гэта якасныя прыслоўі на *-а, -о*), так і пасля галоўнага слова (іншыя прыслоўі), дзеепрыслоўі, неазначальная форма дзеяслова:**
***надта прыгожа, ісці пешшу,***
***чытаць седзячы, вучыцца шыць***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Парадак сінтаксічнага разбору словазлучэнняў

1. Выдзеліць словазлучэнне са сказа.

2. Вызначыць будову словазлучэння: знайсці галоўнае і залежнае словы, указаць, якімі часцінамі мовы яны выражаны, вызначыць спосаб падпарадкавальнай сувязі паміж галоўным і залежным словамі.

3. Ахарактарызаваць парадак слоў.

4. Вызначыць граматычнае значэнне словазлучэння.

**Узор.** Ішлі праліўныя дажджы. (І. Шамякін)

**Словазлучэнне – *праліўныя дажджы*. Галоўнае слова – *дажджы*, выражана назоўнікам, залежнае слова – *праліўныя*, выражана прыметнікам. Сінтаксічная сувязь – дапасаванне. Парадак слоў прамы. Граматычнае значэнне: прадмет і яго прымета.**

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ